УДК 808.26(043)

# Мастацкае асэнсаванне падзей Вялікай Айчыннай вайны ў драматургіі Віцебшчыны

**Аляксеева Т.У.**
***Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск***

*У артыкуле раскрываецца мастацкае асэнсаванне падзей Вялікай Айчыннай вайны ў драматургіі Віцебшчыны. Падрабязна аналізуюцца п'есы Аркадзя Маўзона, Міколы Матукоўскага, Уладзіміра Караткевіча, Аляксея Дударава, Барыса Кантаровіча, Генадзя Катлярова. Характарызуецца жанравая спецыфіка твораў, акрэсліваюцца рэгіянальныя адметнасці ў спадчыне пісьменнікаў пры адлюстраванні падзей Вялікай Айчыннай вайны. Адзначаецца, што аўтары з дакладнасцю перадаюць гістарычныя факты, падкрэсліваюць гераізм і самаахвярнасць беларусаў дзеля Радзімы. Драматургі сыходзяцца ў сваіх поглядах наконт вынішчальнага характару вайны, выказваюць негатыўнае стаўленне да гэтай жудаснай з'явы. Для Г. Катлярова, Б. Кантаровіча, А. Маўзона, М. Матукоўскага актуальнай стала прывязка дзеяння п'ес да віцебскага рэгіёна, ужыванне геаграфічных назваў дадзенай мясцовасці, ілюстрацыя лёсу і подзвігаў сваіх землякоў, паказ самаадданай барацьбы партызан. Падыходы да асэнсавання падзей Вялікай Айчыннай вайны ў драматургічнай спадчыне Віцебшчыны мяняліся ў залежнасці ад часу, у які былі напісаны творы.*

***Ключавыя словы:*** *віцебскі рэгіён, мясцовая драматургія, лакальныя геаграфічныя назвы, падзеі Вялікай Айчыннай вайны, рэгіянальныя адметнасці.*

*(Ученые записки. – 2012. – Том 13. – С. 152–160)*

# Artistic comprehension of the events of the Great Patriotic War in dramatic works of Vitebsk region

**Alekseeva T.V.**
***Educational establishment "Vitebsk State University named after P.M. Masherov", Vitebsk***

*The article considers artistic comprehension of the events of the Great Patriotic War in dramatic works of Vitebsk region. A. Dudarev's, A. Mavzon's, N. Matukovski's, B. Kantarovich's, G. Kotlyarov's, V. Korotkevich's plays are analyzed in details. Genre peculiarities of the works are analyzed, regional features in the writers' heritage while presenting the events of the Great Patriotic War are noted. The playwrights represent historical facts exactly; describe heroism and self-sacrifice of Belarusian people. The playwrights unite in their ideas of the devastating character of the war, they express negative attitude to this horrible phenomenon. G. Katlyarov, B. Kantarovich, A. Mauzon, M. Matukouski set the action of the plays in Vitebsk region, the plays are characterized by a great number of local geographical names. The authors illustrate life and heroic deeds of their fellow-countryman and selfless struggle of partisans. Approaches to understanding the events of the Great Patriotic War in the plays of Vitebsk region transformed regarding the time when the plays were written.*

***Key words:*** *Vitebsk region, local dramatic works, local geographical names, Great Patriotic War events, regional peculiarity.*

*(Scientific notes. – 2012. – Vol. 13. – P. 152–160)*

*Адрас для карэспандэнцыі*: *e-mail:* Alekseevata@mail.ru – **Т.У. Аляксеева**

Тэма Вялікай Айчыннай вайны займае значнае месца ў беларускай літаратуры. Мастакі слова з дакладнасцю перадаюць сапраўдныя факты, выкарыстоўваюць багаты гістарычны матэрыял. Акцэнтуецца ўвага на паказе гераізму і подзвігаў беларусаў, іх самаахвярнага служэння Бацькаўшчыне. Аляксей Дудараў перакананы, што «пра вайну нельга складаць небыліцы... Але ж не ўсё можна ў гісторыі, і нягледзячы на тое, наколькі тыя ці іншыя падзеі аддалены ад нас, усё роўна неабходна прытрымлівацца гістарычнай праўды» [1, с. 6]. Драматургі віцебскага рэгіёна па-мастацку пераасэнсоўваюць ваенныя падзеі, ёміста раскрываюць змаганне тагачасных мясцовых жыхароў, ілюструюць дзейнасць вядомых гістарычных асоб. Засяродзім сваю ўвагу на драматургічнай спадчыне Аркадзя Маўзона, Міколы Матукоўскага, Уладзіміра Караткевіча, Аляксея Дударава, Барыса Кантаровіча і Генадзя Катлярова. У беларускім літаратуразнаўстве разглядаюцца творы пералічаных аўтараў у працах С. Лаўшука, Г. Коласа, А. Сабалеўскага, В. Маслоўскага, А. Сямёнавай, А. Мальдзіса, Э. Садаўнічага, А. Русецкага і іншых. Разам з тым адсутнічае сістэмнае даследаванне па асэнсаванні падзей Вялікай Айчыннай вайны ў драматургіі Віцебшчыны.

Мэта даследавання – выяўленне адметнасцей асэнсавання ваенных падзей драматургамі віцебскага рэгіёна.

**Матэрыял і метады.** Метадалагічную аснову артыкула складае параўнальна-супастаўляльны прынцып даследавання, які дае магчымасць выявіць агульнае і адметнае ў стылёвай манеры пісьменнікаў, паказаць жанравую спецыфіку іх твораў. Аб’ектам увагі з’яўляецца драматургічная спадчына аўтараў Віцебшчыны, якая раскрывае ваенные падзеі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У канцы 40-х – 50-х гг. XX ст. пасля нядаўніх ваенных падзей драматургія толькі пачынала звяртацца да тэмы вайны. Заўважым, што дамінавала гераізацыя подзвігу беларускага народа. Аўтары імкнуліся выпісаць у творах мужных абаронцаў Айчыны, супрацьпаставіць іх ворагам.

Актыўнае развіццё на Віцебшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны меў падпольны і партызанскі рух. Варта ўзгадаць дзейнасць легендарнага змагара за волю і незалежнасць краіны Канстанціна Сяргеевіча Заслонава. Вядома, што вайна застала яго ў Оршы, дзе ён працаваў начальнікам паравознага дэпо. Пры падыходзе ворагаў да горада ён эвакуіраваўся ў Маскву, потым вярнуўся з партызанскім атрадам назад. У Оршы наладзіў сувязь з падполлем і ўладкаваўся на працу ў паравознае дэпо. Сваімі сіламі нямецкія акупацыйныя ўлады не маглі забяспечыць функцыянаванне чыгуначнага вузла, таму вымушаны былі выкарыстоўваць для працы мясцовае насельніцтва. За “тры месяцы дзейнасці К. Заслонава ў дэпо было зроблена 98 крушэнняў варожых цягнікоў, выведзена са строю больш за 200 паравозаў, многа вагонаў з ваеннай маёмасцю” [2, с. 3]. Чыгуначны рух па накірунках Орша–Віцебск, Орша–Смаленск, Орша–Лепель сістэматычна парушаўся. Аршанская падпольная дыверсійная арганізацыя, якой ён кіраваў, складалася з шэрагу груп колькасцю па 5–7 чалавек. Заслонаў асабіста даваў заданні кожнай групе, заўсёды быў верны сваім словам: “Немца мы с мечом, с огнём, танками и самалётами к себе не звали, он сам пришёл привёв в действие средства вооружения, так, пусть-же он поганый немчура и знает, что он же от тех средств и погибнет” [3, с. 71]. У лютым 1942 года гітлераўцы западозрылі Заслонава ў падпольнай дзейнасці, таму ён пакінуў найбольш свядомых рабочых у Оршы для дыверсійнай працы, а сам стварыў партызанскі атрад у лесе. Загадам начальніка Беларускага штаба партызанскага руху Канстанцін Сяргеевіч быў прызначаны камандзірам партызанскай зоны, у склад якой

уваходзілі Аршанскі, Сенненскі, Багушэўскі і Талачынскі раёны. Загінуў змагар ў лістападзе 1942 года ў няроўным баі з фашысцкімі карнікамі ў вёсцы Купаваць Сенненскага раёна.

Вобраз вышэйназванага героя ярка раскрыты ў драматургіі Віцебшчыны. Разгледзім п'есы "Канстанцін Заслонаў" (1947) А. Маўзона і "Паядынак" (1985) М. Матукоўскага. Гераічная драма "Канстанцін Заслонаў" А. Маўзона напісана адразу пасля вайны. Аўтар перадае сцэну ўладкавання на працу па ўласным жаданні былога начальніка Аршанскага чыгуначнага дэпо інжынера Заслонава. Складаны экзамен вытрымлівае герой падчас найму. Менавіта ў гэтым эпізодзе "сутыкнуліся халодны практыцызм Хірта, вельмі абвостраная падазронасць Нейгаўза і не менш абвостраны, глыбока затоены аналіз паводзін сваіх праціўнікаў – у Заслонава. Драматург будуе дзеянні не на выключных якасцях героя, а на глыбокім разуменні абставін: немцам практычна неабходны рускія спецыялісты, і Заслонаў вядзе сугуба практычную размову" [4, с. 122].

Цяжка на душы ў персанажа па той прычыне, што рабочыя лічаць яго здраднікам, аднак выдаваць сябе нельга. Яскрава гэта паказана ў сцэне, калі Крушына (рамонтны майстар дэпо) запускае ў яго гаечны ключ. Былыя сябры не жадаюць размаўляць з ім, з пагардай ставяцца. Заслонаў жа пры немцах паводзіць сябе адпаведна сваёй пасадзе: рэзка аддае загады, з хітрасцю паказвае сваё прыхільнае стаўленне да варожага боку. Персанаж стварае законспіраваную дыверсійную групу, наладжвае яе плённую працу, з несхаванай радасцю лічыць узарваныя варожыя паравозы. Кожная смерць падпольшчыка – удар па сэрцы Заслонава. Пераканальна паказвае гэта А. Маўзон, калі апісвае гібель юнака Жэні Аксаніча. Дзейнасць дыверсійнай групы вельмі значная: робяцца вугальныя міны і падкладваюцца ў паравозы, выводзіцца са строю на некалькі дзён чыгуначны вузел, бо замарожана водаправодная сістэма станцыі, маецца трывалая сувязь з партызанамі. Цэнтральная асоба твора пастаянна шукае новыя спосабы, найбольш правільныя шляхі для шкоды немцам. Ускладняецца дзейнасць героя і наяўнасцю сапраўдных здраднікаў, такіх як, напрыклад, табельшчыка дэпо Бураўчыка. Апошні час пільна сочыць за галоўным героем, падслухоўвае размовы, перадае інфармацыю ворагу.

Здзіўляе фашыстаў стойкасць і моц беларусаў. Гуго Хірт адзначае: "Я баюся, мы нічога не ўлічылі. Не ўлічылі народ, на які пайшлі… Яго псіхікі, яго душы. Людзі паміраюць і не гавораць ні слова…" [5, с. 50]. Высока ацэнена і дыверсійная дзейнасць Заслонава. На думку маёра гестапа Нейгаўза, галоўны герой – "галава, і кожны рабочы ў дэпо, ну, калі не другі, то трэці – яго рукі" [5, с. 44]. Калі Канстанціна арыштоўваюць, сябры не спыняюцца, працягваюць пачатую справу, каб адвесці падазрэнні ад яго. Нездарма аўтар п'есы дакладна пазначае ўзрост Заслонава, праводзіць паралель з Ісусам Хрыстом, кажа, што яму трыццаць тры гады. Думаецца, гэта збліжае дадзеных асоб, пераконвае ў гераічнасці, самаахвярнасці, мужнасці падпольшчыка.

Амаль праз сорак гадоў пасля п'есы А. Маўзона М. Матукоўскім была напісана драма "Паядынак" твор таксама раскрывае той эпізод з жыцця персанажа, калі Заслонаў уладкоўваецца на працу ў Аршанскае дэпо начальнікам рускіх паравозных брыгад. Герой падаецца мудрым, з багатым жыццёвым і практычным досведам, майстрам сваёй справы, добрым псіхолагам. На працягу п'есы адбываецца яго паядынак з прадстаўнікамі варожага боку: Бегерам, Хейге, Вернерам, Маншам.

У кампазіцыйным аспекце твор мае пралог і эпілог, якія лагічна дапаўняюць змест драмы, дапамагаюць лепшаму раскрыццю падзей і характараў герояў. У пачатку п'есы стомленыя, змарнелыя персанажы вяртаюцца з Масквы ў Оршу з канкрэтнай мэтай: пачаць

дыверсійную працу ў дэпо, на чыгунках, каб не змагла загінуць іх справа.

Драматург умела перадае псіхалагічныя напружаныя моманты: просьба Заслонава аб прыёме на працу, размовы з ворагамі. Канстанцін Сяргеевіч імкнецца не раскрыць сябе, адразу цікавіцца заробкам, хітра і разумна будуе адказы на пытанні. Па натуры ж сваёй ён душэўны, адкрыты і даверлівы. Выступае і добрым дарадцам для моладзі, што бачна са шчырай гутаркі з дзяўчынай Тоняй наконт кахання, жонкі Рыты.

Заслонаву даручаюць набраць для працы вартых людзей, за якіх той будзе адказваць сваім жыццём. Герой пастаянна знаходзіцца ў полі зроку фашыстаў, яго кантралююць, правяраюць, выклікаюць на размовы, што нагадваюць допыты. Ён вядзе небяспечную гульню з захопнікамі. “З рэек сыходзяць цягнікі, у топках паравозаў разрываюцца міны, падкінутыя спрытнымі рукамі. Мароз скоўвае водаправод на чыгуначнай станцыі, і нямецкім эшалонам няма ходу ні на ўсход, ні на захад. Усім кіруюць нечыя моцныя сіла і розум” [6, с. 63].

Беларускія змагары ўяўляюць сабою адзінае цэлае, перажываюць адно за аднаго, мужна трымаюцца на допытах. Напрыклад, калі таварышам становіцца вядома, што Манш з’яўляецца нямецкім разведчыкам, то яны адразу пачынаюць прадумваць далейшую схему дзеянняў, каб папярэдзіць Канстанціна. Значнай для ўспрымання цэласнасці асобы персанажа з’яўляецца прамова яго над брацкай магілай у фінале твора, зварот да жывых, дзе раскрываецца несправядлівасць і антыгуманнасць вайны: “Ніхто і нішто не верне матулі сына, жонцы – мужа, дзецям – бацьку!.. Ад імя тых, хто сёння лёг у гэты узгорак, мы пытаемся ў жывых… Людзі! Вас многа!.. І ніхто з вас не хоча вайны і смерці!.. Што ж вы робіце, людзі?.. Вашай крывёй, якую вы пралілі на войнах, можна напоўніць акіян! З вашых касцей, што засталіся на палях бітваў, можна насыпаць горы!..” [6, с. 291–292]. Заклікае задумацца грамадства над тым, што робіцца ў свеце, змагацца да таго часу, пакуль не будуць знішчаны ўсе фашысты.

Як бачна, абедзве п’есы перадаюць значны этап дзейнасці падпольшчыка Канстанціна Заслонава, выяўляюць усю веліч, унутранае хараство дадзенай асобы. Галоўная задача А. Маўзона – раскрыць характар персанажа ў час змагання з фашыстамі, паказаць яго разумовыя здольнасці, гераізм духу. М. Матукоўскі ў сваёй драме акцэнтуе ўвагу на паядынку патрыёта з немцамі, на барацьбе інтэлектаў. Назіраецца спалучэнне дакументальнай асновы твора з прыгодніцкім элементам.

Рамантызацыя гісторыі характэрна для У. Караткевіча. У драме “Млын на Сініх вірах” (1957) спалучаецца апісанне ваенных падзей лета 1942 года з імкненнем аўтара выклікаць павагу ў беларусаў да сваіх каранёў, мовы. Пісьменнік невыпадкова бярэ за эпіграф словы Дантэ:

*Стварылі вас не для жывёльнай долі, –*
*Для доблесці і ведаў. Людзі вы!* [7, с. 247].

Нямецкія вайскоўцы горш за звяроў, бо такія якасці, як спагада, павага да старых, жанчын ім не ўласцівыя. Чалавечнасць становіцца крытэрыем для размежавання персанажаў на станоўчых і адмоўных. Аўтар не вылучае ў творы канкрэтную дзеючую асобу, героямі варта лічыць усіх без выключэння. Гэта Тэкля Каваль, Андрэй Лаўрановіч, Марыся, Елпідзіфор Дзюбка і іншыя. Дадзеныя людзі гінуць з годнасцю, застаюцца вернымі свайму народу, агульнай справе. Смерць дзеля жыцця іншых становіцца іх абавязкам. Напрыклад, Андрэй Лаўрановіч кажа: “…Мы не тыя, што скуголяць. Мы сталі людзьмі… Душу нашу зламаць нельга… Нас у багне тапілі – мы заставаліся жыць, нас прыгняталі пад варожай пятой – мы жылі і паўставалі, у нас адбіралі мову – мы спявалі нашы песні, на нас ішлі навалаю – мы адказвалі Піленамі, Крутагор’ем і Грунвальдам, нас знішчаюць зараз – мы знішчаем вас” [7,

с. 293]. Выяўляецца сапраўды чалавечае ў іх. Андрэй і Марыся шчаслівыя, бо кахаюць адзін аднаго, бо выканалі сваё заданне, засталіся аддадзенымі Радзіме. Тэкля параўноўваецца з вялікай драпежнай птушкай, якая ў любы момант можа накінуцца на ворага. Жанчына атруціла немцаў, самаахвярна дапамагаючы абаронцам Айчыны. Яна пераможца, бо непамерна вышэй за фашыстаў. Жоравы, што адлятаюць на поўдзень, быццам выконваюць гімн жанчыне. Нямецкае кіраўніцтва таксама здзіўляецца непахіснасці духу славян. Аднак званне чалавека ўласціваe не кожнаму, яго "кожнаму трэба заслужыць" [7, с. 286]. Многія не вытрымліваюць цяжару вайны. Толькі ў жудасных умовах раскрываецца і сапраўднае аблічча чалавека. На вайне нараджаюцца здраднікі, якія дзеля свайго ўласнага дабрабыту ахвяруюць жыццём іншых, жадаючы перайсці на бок фашыстаў. Віктар Сміхальскі прапануе каханай дзяўчыне ўсё кінуць, збудаваць жытло і існаваць толькі для сябе. Трапіўшы да немцаў, пасля першага ж катавання, ён здраджвае Радзіме, сябрам.

У "Заўвагах для артыстаў" пісьменнік адзначае, што драма рамантычная, а цэнтральнай дзеючай асобай з'яўляецца "народ, добры і памяркоўны да сяброў, люты і бязлітасны да ворага, народ з аналітычным розумам Каляды, з мудрай іроніяй Цыкмуна, з дзівацкім скепсісам і бязмернай любоўю да Радзімы Дзюбкі, з таямнічай змрочнасцю Тэклі Каваль, з пяшчотнасцю Марысі і нязломнасцю Андрэя..." [7, с. 297]. Гэтыя людзі аказвалі вялікую дапамогу партызанам, забяспечвалі бесперапынныя пастаўкі хлеба ў нялёгкі для краіны час.

Адвечнае пытанне бацькоў і дзяцей таксама хвалюе пісьменніка. Гэта шчырыя, сяброўскія ўзаемаадносіны ў сем'ях Лаўрановічаў і Асінскіх, дзе старэйшае пакаленне заўсёды выслухае малодшае, прапануе карысныя парады.

Перадаючы "драматычныя, нават трагічныя падзеі з жыцця беларускага народа, пісьменнік закранае пытанні нацыянальнага характару, лёсу нацыянальнай культуры, самога існавання нашага народа як беларускага" [8, с. 103]. Выказваецца спадзяванне, што беларусы раскрыюцца па-сапраўднаму праз стагоддзе.

У 80-я гады XX ст. у драматургіі назіраецца імкненне да асэнсавання агульначалавечых, філасофскіх пытанняў праз паказ ваенных падзей. П'есам уласцівы псіхалагізм думкі і ўчынку. Актуальнай становіцца праблема захавання маральнай чысціні чалавека на вайне. Рэалістычны падыход да адлюстравання падзей Вялікай Айчыннай вайны прыйшоў на змену рамантычнаму.

У п'есе "Узлёт" (1980) А. Дударава тры лётчыкі (капітан Барткевіч, штурман-лейтэнант Грышчук, стралок-радыст Вагура) трапляюць у палон да немцаў. Іх самалёт быў падбіты ў час Вялікай Айчыннай вайны, аднак спрытнымі намаганнямі капітана пасаджаны спецыяльна на калону варожай тэхнікі. Групенфюлер Грэйвіц праводзіць эксперымент, каб высветліць псіхалагічныя прычыны вернасці чужаземцаў свайму ваеннаму абавязку, учыняе маральныя і фізічныя іспыты. Адбываецца прафесійная гутарка з героямі з прапановай перайсці на нямецкі бок, таму перад імі паўстае праблема выбару – здрадзіць Бацькаўшчыне ці не. Аўтар адзначае, што ўсе трое да канца жыцця застаюцца нязломнымі, сумленнымі людзьмі.

Грэйвіц здзіўлена сцвярджае Барткевічу: "Вы альбо сляпы фанатык, альбо псіхічна хворы чалавек, што ўрэшце адно і тое ж» [9, с. 208]. Ён мае рацыю, зразумеўшы наступную ісціну: «Чалавек, які не пабаяўся пайсці на верную пагібель адзін раз, не спалохаецца, калі яго будуць біць, ламаць рукі, заганяць пад пазногці іголкі... Гэта аксіёма" [9, с. 190–191].

Аляксей Дудараў доказна пераконвае, што вайна – гэта жудасная з'ява, зло, а фашызм – "хвароба чалавецтва" [9,

с. 208]. Неаднаразова героі задаюць пытанне наконт часу яе заканчэння, даводзячы, што варта спыніць баявыя дзеянні. Да кожнага лётчыка прыходзіць прывід маці, якая застаецца з імі да канца жыцця. Перад смерцю яны ўспамінаюць сваё жыццё да вайны. Жанчына-пакутніца таксама трапіла пад расстрэл, аднак яна неўміручая, спявае калыханку для мужчын. Драматург даводзіць: вайскоўцы не загінулі, а толькі заснулі, памяць пра іх будзе вечнай. Кукаванне зязюлі і прыход восені – сімвалічныя, жыццесцвярджальныя элементы.

Знаходзяцца і здраднікі на вайне (Шумскі, Мардаты), якія далучаюцца да фашыстаў, каб не загінуць. Мардаты гаворыць галоўным героям аб тым, што той, хто здраджвае, не вінаваты, яго прымушаюць абставіны: "... Юда не сам здрадзіў, яго прымусілі! Ён абавязаны быў здрадзіць, каб потым усе людзі адчувалі віну за загубленага Хрыста. І мяне прымусілі!.. " [9, с. 218]. Барткевіч жа лічыць, што ў Мардатага памерла душа, таму той не змог "выстаяць, вытрымаць" [9, с. 218]. Па віне Шуйскага, які "да начальства лез без мыла, круціўся, як скура на сабаку" [9, с. 188], была расстраляна сям'я Цубаніка.

Аўтар пацвярджае, што толькі ў самых бесчалавечных абставінах раскрываецца сапраўдная існасць кожнага. Калі трэба нечым ахвяраваць, ад нечага адмовіцца насуперак сабе, праяўляецца ўся чалавечая годнасць. Філасофская праблема жыцця і смерці таксама набывае актуальнасць у п'есе "Узлёт". Капітан Барткевіч зазначае: "Цяжэй за ўсё заслужыць смерць, якая вартая чалавека… Гэта як узнагарода за ўсё жыццё…" [9, с. 219]. Невыпадкова ўведзена ў мастацкую тканіну твора казка пра смерць. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што добрасумленны чалавек і пасля смерці застаецца жыць у тых справах, якія зрабіў. Заваастраецца ўвага і на тым, што "чалавечае жыццё ў адносінах да вечнасці – бліскавіца" [9, с. 221]. Самае галоўнае, каб гэтая бліскавіца ўспыхнула як мага ярчэй, пакінула пасля сябе значны след, як зрабілі галоўныя героі драматычнай аповесці.

П'есу "Радавыя" (1984) А. Дударава Віталь Маслоўскі называе паклонам "выратаванага пакалення тым, хто яго выратаваў" [10, с. 74], а ўнутраную сюжэтную лінію акрэслівае як "выпрабаванне вайной" [10, с. 74]. Драматычная балада ілюструе перыяд заканчэння вайны. Паказваюцца звычайныя радавыя, іх мары, памкненні ўвесну. Падобныя па напісанні словы "вайна" і "вясна" – антанімічныя з'явы. Першая нясе разбурэнне і смерць, а другая – абуджэнне, новае жыццё. Менавіта таму так раздражнёна паводзяць сябе некаторыя героі, калі чуюць спеў салоўкі. У многіх вайскоўцаў страчаны сем'і, жыллё, няма ніякіх далейшых перспектыў. Прысутнічае толькі жаданне памерці. Героі стаміліся, прайшоўшы доўгі шлях змагання, пакутаў. Складана вызначыць, колькі гадоў асобным персанажам. На прыкладзе санінструктара Ліды бачацца няздзейсненыя жаданні жанчын, імкненне выжыць. Недарэчна гіне Дугін перад самай перамогай (ад стрэлу вінтоўкі глуханямога падлетка), Бушцец, які вырашае адпомсціць за сяброў і бацьку. А. Дудараў перакананы, што нельга прайсці ўсю вайну і застацца такім, якім быў да яе пачатку. У гэтай п'есе аўтар таксама гучна заяўляе, што вайна – гэта вялікае зло, якое суправаджаецца вынішчэннем і смерцю.

У канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. заўважаецца тэндэнцыя да перадачы ў драматургіі саміх ваенных падзей, занатаванне фактаграфічных звестак. Аднак сучасныя аўтары менш увагі надаюць раскрыццю характараў персанажаў, псіхалагізацыі ўчынкаў.

Б. Кантаровіч узнаўляе ў п'есах праўду гісторыі, ілюструе з дакументальнай дакладнасцю дзейнасць знакамітых асоб. Асновамі яго светапогляду з'яўляюцца гуманізм, дэмакратыя і нацыяналізм, якія непасрэдным чынам паўплывалі на

творчую манеру аўтара. У драме з пралогам і эпілогам “Расследаванне ў Іерусаліме” (1995) пераплятаюцца дзве сюжэтныя лініі: суд Халакоста ў Іерусаліме ў 1994 годзе па справе прысваення звання Праведніка свету былому камандзіру партызанскага атрада Мікалаю Пенягіну і апісанне змагання партызан у 1941 годзе. Дзеючы персанаж выратаваў жыццё многім яўрэям з Заходняй Беларусі ў ваенны час. На працягу ўсяго твора ўзвялічваецца роля гэтай нацыі, пацвярджаецца актыўнае змаганне яўрэяў супраць немцаў.

Барыс Кантаровіч, як і ўсе драматургі віцебскага рэгіёна, звяртаецца да паказу кахання на вайне, перадачы шчырых і цёплых пачуццяў, узаемадапамогі. Гэта бачна на прыкладзе Пенягіна і Ліны.

У кінасцэнарыі “Палкоўнік Лакціёнаў” (2000) ужываецца мноства выдуманых герояў, сітуацый, аднак мастацкая задума заснавана на рэальных правобразах і падзеях. Хутка мяняецца месца дзеяння ў творы, згадваюцца такія беларускія гарады і мястэчкі, як Лепель, Полацк, Малыя Жаркі, Орша. Часавы прамежак акрэсліваецца з лютага 1942 года па ліпень 1946 года. Б. Кантаровіч перадае гераізм партызанаў у барацьбе за сваю незалежнасць, апісвае расстрэл яўрэйскіх мірных жыхароў, адзначае дапамогу гэтага насельніцтва беларусам. У п’есе драматурга, як і ў творчасці вышэйзгаданых намі аўтараў, зноў актуальнай становіцца праблема выбару перад героямі: быць здраднікамі ці застацца вернымі краіне. Распавядаецца Кантаровічам пра Рускую вызваленчую армію, створаную генерал-лейтэнантам Андрэем Уласавым, пра рух паплечнікаў апошняга. Дзейнасць іх была накіравана супраць Сталіна і яго камандавання. Яны добраахвотна прапанавалі фашыстам свае паслугі, калі трапілі ў палон. Васіль Лакціёнаў таксама пагаджаецца выконваць даручэнні гэтага аб’яднання. Пасля таго, як яго групу накіравалі на Беларусь для карных мерапрыемстваў, вырашае далучыцца да партызанаў. Лакціёнаўцы даказалі, што не з’яўляюцца здраднікамі: “Это грозная сила – 600 отчаянных мужчин, что подтверждается теми боями с немцами, в которых они участвуют, беспощадным разгромом немецких комендатур и полицейских управ, участием в рельсовой войне и других боевых действиях, присущих партизанской войне” [11, с. 51]. Таму і адбылася рэабілітацыя героя, пасмяротнае ўзнагароджанне.

Цэнтральнай фігурай твора з’яўляецца і камандуючы партызанскім атрадам палкоўнік Лабанаў. Яго задача: разбураць гарнізоны ворага, забіваць здраднікаў, кантраляваць чыгункі. Праяўляюцца такія рысы героя, як жыццёвая мудрасць, павага да іншых людзей.

Неабходна адзначыць, што пастаянная змена месца падзей у п’есе ўскладняе ўспрыманне зместу твора. Аўтар празмерна захапляецца фактамі, таму менш увагі нададзена псіхалагізму.

Гераізм вайскоўцаў ілюструецца і ў п’есе “Мост” (2006) Генадзя Катлярова. У творы раскрываецца ход гістарычных падзей у перыяд вызвалення моста Блахіна ў Віцебску 26 чэрвеня 1944 года. Вядома, што напісана п’еса пасля гутаркі з непасрэдным удзельнікам дадзенай аперацыі Блахіным Фёдарам, Героем Савецкага Саюза. Аўтар апісвае сам працэс па размініраванні моста, ад якога залежыць жыццё жыхароў горада. Менавіта гэты ўчастак дапамагае падтрымліваць сувязь паміж рознымі канцамі Віцебска. Вельмі значныя ў такім становішчы тонкі разлік, вытрымка. Толькі перашкоду аказваюць нястрыманасць і паспешнасць (учынкі Вішні і Вашчылы). Твор вызначаецца напружанасцю і эмацыйнасцю. Драматург перадае зладжаную і арганізацыйную дзейнасць дасведчаных і спрактыкаваных сапёраў, дэвіз якіх: “Кто боится, тот не побеждает” [12, с. 33]. Уздымаецца ў творы і інтэрнацыянальнае пытанне. Напрыклад, камандуючы

ўзводам Вашчыла кажа: “А я не понимаю такого деления: белорусы, украинцы, русские. Мы – славяне и отличаемся только малость говорком. Кровь у нас единая” [12, с. 31]. У ваенных умовах людзей аб’яднала барацьба з агульным ворагам. Варта падкрэсліць захапленне Г. Катляровым дзеяннем, паказам падрыхтоўкі да аперацыі, таму схематычнымі і статычнымі атрымаліся персанажы, цалкам не раскрыты іх характары.

**Заключэнне.** Тэме Вялікай Айчыннай вайны адведзена значнае месца ў драматургіі Віцебшчыны. Поўна і ўсебакова апісваюцца гістарычныя падзеі, якія паслядоўна і лагічна ўплятаюцца ў мастацкую тканіну твораў. Жанравая форма твораў (гераічная драма, драматычная балада, драматычная аповесць, кінасцэнарый) дапамагае пісьменнікам перадаць напружаныя моманты, усебакова раскрыць сутнасць вайны. Для А. Маўзона, М. Матукоўскага, Б. Кантаровіча, Г. Катлярова стала актуальнай прывязка дзеяння да канкрэтных геаграфічных мясцін, ужыванне назваў акрэсленай мясцовасці, аповяд пра змаганне сваіх землякоў. Увядзенне ў кантэкст твораў рэгіянальных элементаў дапамагае драматургам узнімацца да шырокіх абагульненняў, надае творам рысы высокай мастацкай завершанасці і дасканаласці. Аб’ядноўвае аўтараў і імкненне падкрэсліць глыбокі патрыятызм і гуманізм воінаў, самаахвярнасць і адданасць агульнай справе пад час барацьбы з ворагам. Падыходы да асэнсавання падзей Вялікай Айчыннай вайны ў драматургічнай спадчыне Віцебшчыны мяняліся ў залежнасці ад часу, у які былі напісаны творы.

## Літаратура

1. Дудараў, А. Аляксей Дудараў: “Пра вайну нельга пісаць небыліцы”: [гутарка з беларускім драматургам, гутарыла Таццяна Команава] / А. Дудараў // Культура. – 2008. – 28 чэрв. – 4 ліп. (№ 26). – С. 6.
2. Багамазаў, У. Да 75-годдзя з дня нараджэння К.С. Заслонава / У. Багамазаў // Віцебскі рабочы. – 1985. – 5 студз. – С. 3.
3. Папоў, Ф. Герой Савецкага Саюза Канстанцін Заслонаў / Ф. Папоў, С. Шчуцкі. – Мінск: Белдзяржвыд., 1951. – 101 с.
4. Колас, Г. Назад, да “Канстанціна Заслонава” / Г. Колас // Полымя. – 1965. – № 1. – С. 119–135.
5. Маўзон, А. П’есы / А. Маўзон. – Мінск: Маст. літ., 1978. – 312 с.
6. Матукоўскі, М. Мудрамер: выбр. п’есы / М. Матукоўскі. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 344 с.
7. Караткевіч, У. Старыя беларускія хронікі: п’есы / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1988. – 304 с.
8. Садаўнічы, Э. Мастацкая спецыфіка драматургіі У. Караткевіча / Э. Садаўнічы, М. Малчанава // Беларуская літара-тура. – 1990. – Вып. 18. – С. 101–109.

9. Дудараў, А.А. Дыялог: п’есы // А.А. Дудараў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 272 с.
10. Маслоўскі, В. Характары гераічныя – характары народныя. П’есы беларускіх драматургаў пра Вялікую Айчынную вайну / В. Маслоўскі // Роднае слова. – 1999. – № 3. – С. 72–75.
11. Канторович, Б. Невольники чести / Б. Канторович. – Витебск, 2000. – 64 с.
12. Мост: сборник прозы и поэзии / А.Е. Геращенко [и др.]. – Витебск: ЦИТ УО “ВГТУ”, 2006. – 235 с.

*Паступіў у рэдакцыю 24.01.2012 г.*

*Приняты у друк 25.06.2012 г.*